# *§ 19–0. Беларускае грамадства напачатку XX ст.

ДЭМАГРАФІЯ
МІГРАЦЫЯ
САСЛОЎЕ КАНФЕСІЯ
НАЦЫЯ ВЕРАЦЯРПІМАСЦЬ
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ
ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ

**1. Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі.** Рост колькасці насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. адбываўся пераважна за кошт натуральнага прыросту — перавышэння нараджальнасці над смяротнасцю. Перасяленні з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі значнага ўплыву не рабілі. Беларускія губерні ў гэты час паводле росту колькасці насельніцтва займалі лідзіруючыя пазіцыі ў краіне, саступаючы толькі прамыслова развітым паўднёвым раёнам еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, дзе значны быў прыток працоўных перасяленцаў.

**Крыніцы росту колькасці насельніцтва**

Якія вывады можна зрабіць з таго факта, што павелічэнне колькасці жыхароў Беларусі адбывалася ў асноўным за кошт натуральнага прыросту насельніцтва?

**2. Сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва.** Аснову сацыяльнай сістэмы Расійскай імперыі складала саслоўная арганізацыя. Яна вызначала правы грамадзян, пералік заканадаўча акрэсленых даступных для іх прадстаўнікоў заняткаў. Аднак напачатку XX ст. прыналежнасць да пэўнага саслоўя робіцца менш значнай.

**Саслоўны падзел**

Успомніце, што такое саслоўе.

Найбольш верагодныя звесткі пра склад насельніцтва Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. даюць вынікі Усеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. Згодна з імі, 2,4 % насельніцтва беларускіх губерняў з'яўляліся патомнымі

дваранамі, 0,4 % — асабістымі дваранамі, 0,3 % — прадстаўнікамі хрысціянскага духавенства, 0,2 % — ганаровымі грамадзянамі, 0,2 % — купцамі, 20,9 % — мяшчанамі, 75,3 % — сялянамі.

Складзіце дыяграму, якая адлюстроўвала б саслоўны склад насельніцтва Беларусі паводле звестак перапісу 1897 г. Якія высновы можна зрабіць з гэтых статыстычных даных?

## Нацыянальны склад

Насельніцтва Беларусі было шматнацыянальнае. Большасць яго складалі беларусы.

Істотна адрозніваўся нацыянальны склад гарадскіх і вясковых жыхароў Беларусі. Прадстаўнікі этнічнай большасці складалі ў гарадах 13,2 %, рускія — 17,8 %, палякі — 11,8 %, яўрэі — 53,2 %. На вёсцы беларусаў было 70,5 %, рускіх — 4,1 %, палякаў — 4 %, яўрэяў — 8,7 %.

Чым абумоўлена адрозненне нацыянальнага складу насельніцтва горада і вёскі?




*Нацыянальны склад насельніцтва беларускіх губерняў паводле звестак перапісу 1897 г.*

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Выкарыстоўваючы звесткі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь (https://www.belstat.gov.by), пабудуйце кругавую дыяграму, якая будзе адлюстроўваць нацыянальны склад насельніцтва нашай краіны.

Параўнайце сучасныя звесткі са звесткамі перапісу 1897 г. Як звязаныя змены ў нацыянальным складзе насельніцтва з гістарычнымі падзеямі, што адбываліся ў XX ст.?

**Канфесійны склад насельніцтва Беларусі**

На працягу многіх стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі жылі прадстаўнікі розных канфесій. Пасля правядзення ў 1839 г. Полацкага царкоўнага сабора, на якім іерархі ўніяцкай царквы ажыццявілі ўз'яднанне ўніяцкай царквы з праваслаўнай, большасць жыхароў беларускіх губерняў сталі складаць праваслаўныя.

Павелічэнню колькасці праваслаўных у беларускіх губернях у другой палове XIX ст. спрыялі пераходы з іншых канфесій, у тым ліку пад уплывам мерапрыемстваў урада, надання розных правоў і прывілей эканамічнага характару. На мяжы XIX–XX стст. праваслаўныя складалі 60,1 % насельніцтва беларускіх губерняў, каталікі — 22,8 %, іўдзеі — каля 14,2 %.

У красавіку 1905 г. імператар Мікалай II выдаў указ «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці», дзе зацвярджалася права на свабоду веравызнання. На заканадаўчым узроўні дапускаліся пераходы з адной канфесіі ў іншую, адмяняліся абмежаванні ў дачыненні да неправаслаўных хрысціянскіх канфесій. Але пры гэтым захоўвалася прыярытэтнасць пазіцый у дзяржаве праваслаўнай царквы.

**Павышэнне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва**

**3. Адукацыйны ўзровень насельніцтва.** Дынамічныя працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі напачатку XX ст. патрабавалі больш высокай адукаванасці рабочай сілы, таму суправаджаліся ўдасканаленнем сістэмы адукацыі. Назіраўся рост матывацыі ў авалоданні пісьменнасцю. На мяжы XIX–XX стст. сялянства пачало ўспрымаць школу як карысную справу для сваіх дзяцей. Змены адбываліся на працягу жыцця аднаго пакалення. Спачатку маці не хацелі аддаваць сваіх сыноў у школу, баючыся, што іх забяруць салдатамі ў войска, а потым плакалі, калі іх не прымалі: не даюць магчымасці «выйсці ў людзі». Часцяком вясковыя жыхары з уласнай ініцыятывы арганізоўвалі школы. Колькасць школ, якія штогод

Як вы разумееце сэнс выразу «выйсці ў людзі»? Пра што сведчыць рост жадання сялян даць адукацыю сваім дзецям?



*Нясвіжская настаўніцкая семінарыя*



*Гродзенская жаночая Марыінская гімназія*

Пры дапамозе дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, якія яшчэ навучальныя ўстановы былі адкрытыя ў другой палове XIX — пачатку XX ст. у Беларусі.

адкрываліся ў Беларусі напачатку XX ст., у тры — сем разоў перавышала аналагічны паказчык у 90-я гг. XIX ст.

Згодна са звесткамі перапісу насельніцтва 1897 г., узровень пісьменнасці жыхароў Беларусі вагаўся ад 33,9 % у Віленскай губерні да 23,3 % у Магілёўскай. Да пачатку Першай сусветнай вайны ўдзельная вага тых, хто вучыўся ў школах у Беларусі, вырасла ў параўнанні з канцом XIX ст. амаль у два разы. Так, у Мінскай губерні за 1898–1913 гг. доля школьнікаў сярод усяго насельніцтва павялічылася з 3,5 да 6,0 %.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, які ўнёсак у развіццё адукацыі на тэрыторыі Беларусі зрабілі класікі беларускай літаратуры Алаіза Пашкевіч (Цётка) і Канстанцін Міцкевіч (Якуб Колас). Падрыхтуйце паведамленне (або прэзентацыю).



*Алаіза Пашкевіч (Цётка)*



*Якуб Колас*

**4. Фарміраванне інтэлектуальнай эліты.** Рост сістэмы адукацыі, развіццё медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, пашырэнне патрэбы грамадства ў развіцці навукі, літаратуры, мастацтва шмат у чым вызначылі фарміраванне інтэлектуальнай эліты Беларусі. Інтэлігенцыя Беларусі (грамадскі пласт людзей, якія прафесійна займаюцца разумовай працай) больш значнае месца адводзіла вырашэнню сацыяльных праблем грамадства.

Фарміраванне інтэлігенцыі Беларусі непасрэдна залежала ад рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў у сацыяльна-культурнай сферы. Больш за тое, улада ставіла перад ёю задачы ўмацавання рускіх дзяржаўна-палітычных асноў насуперак польскаму ўплыву. Аднак адсутнасць вышэйшых навучальных устаноў, дзяржаўных музеяў, афіцыйных навуковых

**Фактары фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі Беларусі**

Як вы лічыце, чаму сярод пытанняў, што хвалявалі інтэлігенцыю Беларусі, значнае месца займала вырашэнне сацыяльных праблем?

арганізацый тармазіла станаўленне інтэлектуальнай эліты.

Інтэлектуальная эліта Беларусі вылучалася шматнацыянальным складам, прычым беларуская нацыянальная яе частка была далёка не самай значнай. На мяжы XIX–XX стст. сярод тых, хто займаўся ў беларускіх губернях вучэбнай і выхаваўчай дзейнасцю, 55,6 % былі яўрэямі, 18,4 % — беларусамі, 16,4 % — рускімі, 5,1 % — палякамі.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**ЯНКА КУПАЛА**

**Спадчына**

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.
...
І ў белы дзень і ў чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з’едзены.
Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі.
Жыве з ім дум маіх сям’я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

*1918*

1. *Як вы лічыце, якія гістарычныя падзеі маглі абумовіць напісанне Янкам Купалам верша «Спадчына»?*
2. *Які наказ утрымліваецца ў гэтым вершы для будучых пакаленняў беларусаў?*
3. *Канкрэтызуйце прыкладамі, як сёння ў нашай краіне выконваецца запавет класіка беларускай літаратуры.*

*Беларускае грамадства пачатку XX ст. з’яўлялася шматнацыянальным і шматканфесійным. Ішоў працэс фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі. Назіралася павышэнне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
| --- | --- |
| 1896 г. — правядзенне I Алімпійскіх гульняў сучаснасці | 1897 г. — першы перапіс насельніцтва |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Пералічыце магчымыя фактары росту насельніцтва краіны. Які з іх быў вызначальны для беларускіх губерняў у канцы XIX — пачатку XX ст.?
2. Прамысловая рэвалюцыя прывяла да росту міграцый насельніцтва. Назавіце асноўную прычыну міграцый насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст. Якія яшчэ прычыны прыводзілі да актывізацыі міграцыйных працэсаў? Якія пласты насельніцтва яны маглі ахопліваць?
3. Растлумачце значэнне ўказа Мікалая II «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці» для беларускага грамадства пачатку XX ст.
4. Як змянілася стаўленне да адукацыі беларускіх сялян на мяжы XIX — пачатку XX ст.? Растлумачце прычыны гэтага змянення.
5. Назавіце фактары, якія ўплывалі на фарміраванне інтэлектуальнай эліты беларусаў у канцы XIX — пачатку XX ст. Якія з іх аказвалі станоўчы, якія — негатыўны ўплыў?
6. Падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) аб развіцці адукацыі ў Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.